# МАГУТНЫМ ВУЛКАНАМ РЭВАЛЮЦЫЙНАЙ ЭНЭРГІІ
# БЫЎ ЛЕНІН,
## ЗА ЯКІМ БУШУЕ ЦЭЛАЕ МОРА РЭВАЛЮЦЫЙНАЙ ЛАВЫ. ЯНА ЗАХЛІСТВАЕ КАПІТАЛІСТЫЧНЫ СЬВЕТ

Пралетары ўсіх краіў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (б) Беларусі.

Год выданьня — XV
№ 20 (3924)
СЕРАДА, 21 СТУДЗЕНЯ 1931 г.

Цана нумару 5 кап.
Выходзіць бесьперапынна

## Ленінізм у дзеяньні

Сем год, якія прайшлі са дня сьмерці правадыра працоўных і эксплёатуемых мас сьвету, бліскуча пацьвердзілі правільнасьць ленінскай тэорыі і ленінскай стратэгіі. Ленінскае вучэньне — ленінізм — «марксызм эпохі імпэрыялізму і пралетарскай рэвалюцыі... тэорыя і практыка пралетарскай рэвалюцыі наогул, тэорыя і тактыка дыктатуры пралетарыяту ў асаблівасьці» (Сталін) — зьявілася непераможнай зброяй сусьветнага пралетарыяту ў яго змаганьні за зьнішчэньне ўсіх форм эксплёатацыі чалавека чалавекам, за зьвяржэньне капіталізму — устанаўленьне дыктатуры пралетарыяту і за пабудову сацыялізму.

На адной шостай частцы зямнае кулі перамог пралетарыят і, пад кіраўніцтвам сваёй партыі і яе ленінскага ЦК, умацніў уладу рабочае клясы — савецкую сыстэму — дыктатуру пралетарыяту.

Ва ўсім сьвеце, які яшчэ застаецца пад уладай капіталу, ленінізм яднае пад сьцягам пралетарскай рэвалюцыі і яе штабу — Камуністычнага Інтэрнацыяналу — мільёны нявольнікаў капіталу, зьяўляючыся для іх вернейшым чулым компасам, які паказвае кірунак удару па ворагу...

## Ленін і праверка выкананьня

Сацыялістычнае будаўніцтва ідзе ва ўмовах абвостранага клясавага змаганьня. Мы будуем сацыялізм у капіталістычным акружэньні, пры шалёным супраціўленьні кулакоў, рэштак гарадзкой буржуазіі, чыноўніцтва і д. п. варожых пралетарыяту пластоў. Капіталістычнае акружэньне не абмяжоўваецца роляю простага наглядальніка. Камівояжэры вайны езьдзяць па Эўропе, арганізуючы змову вайны супроць краіны дыктатуры пралетарыяту.

У гэтых умовах пралетарыят, які апіраецца на бядняцкія і калгасныя масы сялянства у саюзе з серадняком, вядзе барацьбу за тое, каб як мага хутчэй выканаць пяцігадовы плян народнай гаспадаркі. Чаго мы так сьпяшаемся? Чаму нельга будаваць больш павольнымі тэмпамі...





Л. ЯКАЎЛЕЎ



